№ 13 (129). Вільня, 5 Чэрвеня 1938 г. Год X.

Шлях Моладзі
Šlach Moładzi

ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСАПІС БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ

SAPRAŪDNYJA PASTYRY BIEŁARUSKAHA NARODU

Miesiac tamu nazad u Vilni pajaviłasia novaja biełaruskaja knižka „Božaje Słova". Redkaja heta źjava ŭ biełaruskim harotnym žyćci. Na kolki-ž adnak jana redkaja na hetulkiž i cennaja. Užo samo, proźvišča aŭtora ks. Adama Stankieviča — viedamaha biełaruskaha pravadyra i sam nazoŭ knižki „Božaje Słova" havorać nam, što heta vialiki ŭkład u biełaruskuju relihijnuju litaraturu.

Ks. Ad. Stankievič, jaki biazupynna pracuje dla spravy adradžeńnia Biełaruskaha Narodu, budziačy jaho da lepšaha žyćcia i adnačasna namiačajučy šlachi, jakimi jon maje iści, dasiul vydaŭ užo 14 svaich knižak (15-taja-ž znachodzicca ŭ druku) z haliny historyi, litaratury, chryścijanskaje navuki i ahułam kultury. Kožnaja z hetych knižak, jość sapraŭdy fundamentalnym układam u biełaruskim adradženskim ruchu. Kožnaja źjaŭlajecca, byccam, adkazam na tyja pytańni, jakimi vorahi Biełarusaŭ, chacieli-b źbić Biełaruski Narod z pravilnaha šlachu na biezdarožža, kab tam jon biazślednа zhinuŭ. Toje adnak, što Bieł. Narod maje takich vialikich pravadyroŭ, katoryja patrapiać adbić kožny varožy nastup, na jahonuju historyju, litaraturu, na jahonyja pryrodnyja pravy i h. d. jość najlepšaj zarukaj, što jon budzie žyć. — Jak-ža maje žyć? — na heta pytańnie ks. Ad. Stankievič daje adkaz u „Božym Słovie".

„Božaje Słova" — heta knižka, u jakoj źmieščany Lekcyi, Evanelii i pramovy (kazańni) na niadzieli i śviaty (na cely hod). U niadoŭhich, ale syntetyčnych, źmiastoŭnych i strojnych svaich pramovach, apiortych na navucy Chrystovaj, ks. Ad. Stankievič zakranaje ŭsie žyćciovyja i Božyja spravy. Tut my znachodzim takija hłybokija temy: Navuka i Relihija, Ab padziele dabrom, Jak čałaviek pavinien adnosicca da sučasnych bahaćciaŭ, Ab patrebie viery i ab pryčynach niaviery, Ab patryjatyźmie, malitvie, chryścijanskaj spraviadlivaści, ab nierazarvalnaści žanimstva, Ab skančeńni śvietu i h.p. Pry tym ks. Ad. St. u svaich razvažańniach biare pad uvahu sučasnyja dasiahnieńni navuki, a takža sučasnyja ideolohičnyja i hramadzkija kirunki, jak kamunizm, fašyzm i inš.

Hetu knižku pavinien paznać kožny biełaruski intelihient. Hetu knižku pavinien tak-ža čytać kožny biełaruski sielanin i rabotnik, jaki nia maje ŭ śviatyni kazańniaŭ u rodnaj movie i nia moža naležna zrazumieć Chrystovaje navuki ŭ čužoj jamu movie. Heta knižka pavinna znajścisia pad kožnaj sałamianaj strachoj, kudy pasyłaje jaje aŭtor, kab niasła tudy adviečnuju Chrystovuju navuku, krapiła ŭ Biełaruskim Narodzie dušu ŭ jaho imknieńni da lepšaha žyćcia, da žyćcia śviedamaha nacyjanalna i relihijna, da śviatła i Praŭdy... Kab budziła da pracy, katoraja „i biełaruskamu narodu, pakryŭdžanamu silnymi hetaha śvietu, złučanaja z malitvaj da Boha, dapamoža stać na darohu voli, ščaścia i doli". (bač. 42). Knižka zakončana symbaličnaj pramovaj ab śviatoj biełaruscy—kniazioŭnie Afrasińni, apostałcy i prašviacicielnicy Biełarusi.

„Božaje Słova" jość jašče adnym dakumantam, što ks. Ad. Stankievič jość sapraŭdnym evaneličnym pastyram Biełaruskaha Narodu, jakomu pakazvaje pravilny šlach i ab adradžeńnie kataraha jak duchovaje tak i nacyjanalnaje tak mocna dbaje, paśviačajučy jamu ŭsiu svaju pracu i ŭsio svajo žyćcio.

Pišučy ab „Božym Słovie" i jaho słaŭnym i vialikim aŭtory ks. Ad. Stankieviču, nielha abminuć siańnia dvuch tak-ža vialikich synoŭ Biełaruskaha Narodu: ks. J. Hermanoviča i ks. V. Šutoviča, katoryja sioleta ŭ červieni miesiacy śviatkujuć 25-tyja ŭhodki svajho kapłanstva.

Što ks. Jazep Hermanovič i Vincuk Advažny heta adna i taja-ž samaja asoba, zdajecca nia ŭsim jašče viedama. A ŭžo adnak pišučy ab adnym, nia možna maŭčać ab druhim. Bo abodva hetyja proźviščy zaniali pavažnaje miesca ŭ biełaruskim žyćci i biełaruskaj litaratury.

Ks. J. Hermanovič syn biednaje praletarskaje siamji z Ašmianščyny, radziŭsia ŭ 1890 h. Budučy z małych dzion hłybaka pabožnym, paśviaciŭsia jon duchoŭnamu stanu i končyŭšy duchoŭnuju seminaryju ŭ 1913 h. staŭsia ksiandzom. Pastyrskuju svaju pracu pravodziŭ pieravažna pabiełarusku. Havaryŭ pabiełarusku kazańni, vučyŭ svaich parachvijan biełaruskich relihijnych pieśniaŭ i ŭsiudy, dzie tolki moh, pry vykanańni svaich pastyrskich abaviazkaŭ, havaryŭ z narodam pabiełarusku. Volny-ž čas ad pastyrskich svaich abaviazkaŭ paśviačaŭ biełaruskaj narodnaj spravie: zakładaŭ biełaruskija škoły, pašyraŭ siarod sialanstva biełaruskija knižki i hazety, uśviedamlaŭ narod na roznych zborkach i cikaviŭsia bieł. piśmienstvam. A ŭreście ŭ 1919 h. pačaŭ pisać, spačatku artykuły ŭ „Krynicy", a paśla vieršy i bolšyja rečy, jak poviešć „Chłapiec" i inš.

Johonyja tvory: „Jak Kaziuk sabraŭsia da spoviedzi“, „Kaziukovaje žanimstva“, „Adam i Anielka“ źjaŭlajucca lohkimi apaviadańniami z sialanskaha žyćcia i pavučajuć, jak treba žyć na śviecie pavodle Chrystovaje navuki, kab być zdarovym na dušy i ciele. Apracza hetaha ks. J. Hermanovič pad pseŭdonimam V. A. (Vincuk Advažny) piša i pierakładaje na biełaruskuju movu tvory inšych paetaŭ charaktaru humorystyčnaha, jak „Hanuliny kłopaty“, „Kaniok Harbuniok“, „Kazka ab rybaku i rybcy“ i inšyja. Piša V. A. i vieršy pavažnaha charaktaru, katoryja častkava vydany ŭ zborniku „Biełaruskija cymbały“, a taksama vielmi pryhožyja, rezkija i hłybokija źmiestam baśni.

Knižki V. Advažnaha, asabliva humarystyčnyja, šyraka jduć u narod i karystajucca vialikaj papularnaściu prabivajučy darohu ahułam biełaruskaj litaratury pad sałamianyja strechi.

Takim čynam zasłuhi ks. Jazepa Hermanoviča prad Biełaruskim Narodam sapraŭdy vialikija, imia-ž jaho ŭ biełaruskaj litaratury zajmaje što-raz bolš pavažnaje miesca.

Druhi jubilat ks. V. Šutovič, rodam z vioski Šutavičy, Smarhonskaj voł., Ašmianskaha pav. Skončyŭšy seminaryju byŭ niejki čas vikarym u vilenskaj katedry. Paśla skončyŭ jašče dva kursy Duchoŭnaj Akademii ŭ Pietrahradzie, nia mohučy-ž dalej vučycca z pryčyn matarjalnych, viarnuŭsia na Baćkaŭščynu i ŭ 1917 h. byŭ naznačany na probaršča ŭ Baradzieničy, Brasłaŭskaha pav. Tut pieražyŭ jon tryvožny čas kryvavaje revalucyi. Adzin u pryfrantovaj pałasie, siarod buraŭ kiravaŭ pavieranaj jamu parachvijaj, pracujučy vytryvała dla rodnaj kultury. Pa žudaściach revalucyi pryjšła niamieckaja akupacyja. Nastupili biezahladnyja rekvizycyi, a za imi farmalny hoład. Nie pierapužała heta ks V. Šutoviča. Razam z narodam žyŭ i razam haravaŭ. — Urešcie pryjšli balšaviki. Susiednija ksiandzy badaj usie pakidali parachvii i paŭciekali. Ks.Šutovič nia spužaŭsia i balšavikoŭ. Mieŭ čystaje sumleńnie prad Boham i prad narodam.

I hetak pražyŭ ks. V. Šutovič na stanoviščy probaršča ŭ Baradzieničach dziesiać hadoŭ siejučy słova Božaje ŭ rodnaj movie. Ale ksiondz hety dziejnaść svaju nie abmiežvaŭ tolki da svajej parafii. Jon časta havaryŭ biełaruskija kazańni i ŭ mnohich susiednich parachvijach, jak Novy-Pahost, Šarkaŭščyna, Hermanavičy, Ikaźń, Dalokija, Druja, Jody, u kaplicach Baradzienickaj parachvii: Baravyja, i Navałaka, u Udziale, a tak-ža ŭ Vilni i Žodziškach. Narod słuchaŭ jaho zaŭsiody z vialikaj prychilnaściaj i radaściaj i ciapier toj čas uspaminaje z lubaściaj.

Vialikuju adnak hetu relihijna-kulturnuju rabotu ks. V. Šutoviča spyniŭ arcybiskup Jałbžykoŭski. Jon u 1927 h. adarvaŭ ks. Šutoviča z lubych Baradzieničaŭ, z jakimi tak zžyŭsia i naznačyŭ jaho vikarym i to ŭ tyja miascy, dzie nia moh-by spatykać biełarusaŭ i dzialicca z imi svajej viedaj i luboŭju da rodnaha kraju. Nie ściarpieŭ hetaha ks. V. Šutovič i vyjechaŭ u Ameryku, dzie pracavaŭ siarod biełaruskaj emihracyi. Luboŭ adnak da rodnaha kraju nie davała jamu spakoju i jon uznoŭ viarnuŭsia na Baćkaŭščynu i ciapier pracuje ŭ Chorašču kala Biełastoku, jak vikary. Mnoha praciarpieŭ ks. V. Šutovič i ŭsio, jak sam kaža ŭ svaich uspaminach u „Chryśc. Dumcy“, dziela taho, što trymaŭsia śmieła svaich biełaruskich pierakanańniaŭ i svajho biełaruskaha śvietapahladu. Ciarpieńni adnak nia źbili jaho z pravilnaha biełaruskaha i katalickaha šlachu i ks. V. Š. dalej u mieru mahčymaściaŭ pracuje dla dabra Biełaruskaha Narodu.

Ciažkaja daroha biełaruskaha dziejača, palityka, kulturnika, paeta, piśmieńnika. Ciažkaja daroha navat biełaruskaha duchoŭnika — ksiandza ci śviaščeńnika... Prychodzicca mnoha pieražyvać, a navat i ciarpieć. Ale čym bolš pieražyvańniaŭ, čym bolš ciarpieńniaŭ, tym bolš uzrastaje aŭtorytet i značeńnie tych ludziej, jakija ŭsio heta musiać pieraniaści, adčuć na svajej skury, na svajej dušy... — Praca-ž biełaruskich vołataŭ, praca sapraŭdnych synoŭ i pastyraŭ Biełaruskaha Narodu daje vialikija płady i ab joj i ab tych što jaje pravodzili budzie pamiatavać biełaruskaja historyja, budzie pamiatavać Biełaruski Narod.

J. N.

Dr. Jadviha i Stanisłaŭ Hrynkievičy 8)

Umovy i zahady nieabchodnyja dla zdaroŭja

Hygijena spažyvieckich praduktaŭ

Jak užo było skazana, miasa heta ježa nadta smašnaja. Pobač svaje svomaści smakavaje, jano i karysnaje. Smašnaść abasnovana prysutnaściu ekstraktyŭnych u jom materyjaŭ, jakija pryjemna pachnuć („ślinka ciače“) i vyklikajuć vydzialańnie sokaŭ straŭnickich i z inšych załozaŭ u tonkich kiškoch. Najlepšaja forma pryhataŭleńnia miasa, kali smakavyja i karysnyja svomaści miasa nie addzieleny ad siabie. U takich umovach arhanizm najlepš prysvojvaje sabie miasa. Dziela hetaha kusok miasa ŭvodziać raptoŭna ŭ atmasferu vialikaje haračyni, padsmažyvajučy jaho na kłustaści, abo apuskajučy u haračuju vadu. Dziakujučy haračyni samaja vonkavaja čaść białka miasa ćviardzieje i nie daje vyciakać sokam miasnym. Takoje miasa budzie smašnaje.—Kali chočam mieć smašnuju *poliŭku* (buljon), tady naadvarot miasa kładziem u chałodnuju vadu, pakidajem krychu jaho pastajać, kab lepš vyciahnuć soki. Kab chutčej vyciahnuć usie soki, miasa treba parubać na drobnyja kusočki. Vada z miasa budzie nadta smašnaja, zatoje miasa mała karysnaje.

Kožnaja žančyna na vioscy viedaje, što *ciažka chvoramu* treba davać buljony (poliŭki) miasnyja. Pašto jany, kali karyści z ich mała? Jość našto davać chvorym hetkija poliŭki: dziela henych smakavych ekstraktaŭ. Jany vyklikajuć u abniadužaŭšych achvotu da jady, a potym lepš pierarablajecca kožnaja strava.

Vyvaranaje z buljonu miasa maje ŭ sabie ŭsie karysnyja časci, tolki jano mienš smašnaje, niejkaje „vadzianistaje,“ „nytkaje“ — jak časta kažuć. Najlepšaje miasa śviežaje. Śviežaść treba razumieć tak, što možna brać u kuchniu miasa, jakoje pałažała prynamsia 1—6 hadzin. Tolki ŭ niekalki hadzin paśla śmierci žyvioły miasa maje svoj smak. Kali chavajem miasa tolki na paru dzion, asabliva-ž uletku, dyk treba zabiaśpiečycca, kab jano nie pačało hnić. Ahulnaja čyścinia ŭ raźnika, u pamieškańni, dzie miasa lažyć, heta varunak pieršy i najvažniejšy. Kali na miasa siadajuć muchi, kali kožny chapacimie jaho papeckanymi rukami, kali pakładziena jano ŭ tuchłym pamieškańni, dyk doŭha nia treba budzie ždać, a pakažucca na hetkim miasie pleśni, abo pačnie jano hnić abo ŭreście papsujecca jano biez asablivych prymietaŭ, hledziačy zvonku; a budzie usio-ž nadta škodnym dziela zdaroŭja.

Nie zaŭsiody i ŭsiudy možna karystacca vy-

Цяжкі лёс беларускага школьніцтва

Справа беларускага школьніцтва ў Польскім Гаспадарстве ніяк ня можа выйсьці з сьляпога завулка, у якім апынулася бадай ад самага пачатку існаваньня адроджанае Рэчыпаспалітай. Пры тым найбалючэйшым ёсьць тое, што ня відаць палепшаньня. Наадварот, як прыйдзе вясна — канец школьнага году,— дык зьяўляемся сьведкамі розных зьменаў, каторыя астаўляюць па сабе толькі сумныя сьляды. Фактам ёсьць, што лік школаў пачатковых, у якіх была „браная пад увагу беларуская мова," ўсьцяж зьмяншаецца. Фактам так-жа ёсьць, што з 7-мі беларускіх гімназіяў асталася толькі адна віленская, каторая зьяўляецца ужо толькі філіяй польскае гімназіі ім. Славацкага, заціснутай у цёмныя і цесныя куткі. Ня гледзячы на гэта Віленская Беларуская Гімназія прыцягвае да сябе кандыдатаў з усіх бакоў. Адчуваецца вялікая нястача месца. У адну толькі першую клясу ў мінулым годзе было больш 80 кандыдатаў, тады як месца ёсьць толькі для 40 і гэтулькі ўсяго было прынята, а рэшта мусіла астацца дома — ў цесныя вёсцы...

Гэта ўсё гаворыць, што Беларуская Гімназія павінна атрымаць большае памешканьне, права на адчыненьне раўналежных клясаў і ясна павінна атрымаць урэшце адабраныя ёй правы адзельнае незалежнае школы. Гэтага вымагаюць ня толькі патрэбы характару чыста асьветна-школьнага, але таксама справа сужыцьця народаў—польскага і беларускага.

Што чакае Віленскую Беларускую Гімназію з боку школьных уладаў, нам ня ведама. Хочам аднак пры гэтым сьцьвердзіць факт, што ў „Dzienniku Urzędowym Kuratorium Okręgu Szkolnego Wileńskiego", № 6—7 з дня 1.VI. 1938, у афіцыяльным урадавым аддзеле: „Арганізацыя школаў" (бач. 205), у сьпісе віленскіх гімназіяў на 1938—39 г., Беларускае Гімназіі чамусьці няма. Няма так-жа гімназіяў польскіх ім. Ю. Славацкага і ім. Ад. Міцкевіча, якія месьцяцца разам у тым-жа самым будынку, што і гімназія беларуская. Не падана, праўда, так-жа, якая гімназія ў Вільні будзе першая, а ёсьць толькі нумары гімназіяў: II, III і IV. Знача лёс гімназіяў: беларускай, ім. Ю. Славацкага, ім. Ад. Міцкевіча яшчэ ня вырашаны і мусіць тут будуць нейкія рэформы...

Беларусы, якім усе дагэтуляшнія рэформы выходзілі на некарысьць, на гэты раз хіба-ж не патрабуюць спадзявацца чагось ня добрага для апошняе беларускае сярэдняе школы... Карыстаючы аднак з часу і ведаючы ўжо з зваротаў з вёскі да „Шляху Моладзі" па інфармацыі ў справе бел. гімназіі, што наплыў кандыдатаў да гэтае школы і сёлета будзе вялікі, прыпамінаем аб патрэбе расшырэньня адзінае беларускае сярэдняе школы, каторая ня можа заспакоіць нават мінімальных патрэбаў беларускага насельніцтва.

Адначасна зьвяртаемся да ўсіх польскіх дзеячоў, якім справа асьветы, а таксама справа сужыцьця народаў нашага краю ёсьць блізкай, зьвярнуць увагу на патрэбу для беларусаў школаў у іх роднай мове, як пачатковых, так і сярэдніх, каторых Народ Беларускі жадае і гэтыя жаданьні належна падтрымаць прад дэцыдуючымі ўладамі.

Я. Н.

Моладзі

Гэй, моладасьць — парыў!
Пакуль кроў гарача,
Да сонца, да зары
Сьпяшай, хто ня стары,
Бо сонца шлях нам знача.

Няхай злуе віхор,
Няхай скавыча нема
Да сонца на прастор
Сьпяшай на сход на збор —
Мы там сьвятло сустрэнем.

Хай ногі ломяць брук,
Зямля хай стогне нема.
Гэй, не шкадуйця рук,
Да сонца, да навук!
Насустрач пойдзем сьмела!

П. Граніт.

---

klučna śviežym miasam. Biełaruskaja vioska tutaka asablivym prykładam na druhuju askrań, dzie ludzi jadziać amal nia vyklučna miasa staroje, hetkim, ci inšym sposabam zakonservovanaje. Dy jak jano jnakš moža i być, kali čałaviek kole adnaho paršuka ŭ hod, a bahaciejšy—jšče adnu-druhuju aviečku.

Vioska našaja viedaje tolki dva sposaby konservacyi: saleńnie i vendžańnie. Ahułam usie sposaby konservacyi dzielać na *fizyčnyja i chimičnyja.*

Da pieršaje hrupy naležyć *zamarožvańnie miasa*. Jano tady doŭha nie mianiaje ani vyhladu, ani inšych svaich svomaściaŭ. Zamarožvańniem šyraka karystalisia ŭ Amerycy ŭ apošniuju vajnu, davoziačy miasa da vojska ŭ Eŭropie. Smašnaje miasa. Raspaŭsiudžany heny sposab byŭ i ŭ Rasiei (na Sybiry).

Inšy sposab kanservacyi, heta *„miasa dušanaje,"* dzie miasa varycca, potym kładuć jaho ŭ blašanyja skrynački i sterylizujuć ich. U hetkich skrynačkach miasa moža lažać praz doŭhija hady.

Treci sposab — *sušeńnie.* Pry sušeńni miasa režuć na pajaski i viešajuć ci kładuć na niejkich pasudzinach i trymajuć ŭ temperatury 50—55 hradusaŭ.

Krychu padobny da apošniaha budzie inšy sposab kanservacyi, dzie *mieluć* vysušanaje pieradom miasa, abo mieluć syroje i sušać na parašok. Pradajuć hetkaje miasa ŭ skrynačka ch.

Vendžańnie — heta sposab u nas nadta raspaŭsiudžany, popularny, davoli prosty i dobry pry małoj haspadarcy i małoj kolkaści miasa. Hledziačy z boku sanitarnaha ničoha nia možna tutaka zakinuć.

Toja samaje možna kazać i ab chimičnych sposabach — *saleńni i marynavańni.* Saleńnie ŭ nas heta nadta viadomaja sprava. Marynavańnie niama viedama dziela jakich pryčynaŭ nie karystajecca zusim popularnaściu. Adnaho-ž saleńnia jašče mała. Dobra ŭsie viedajuć smahu ŭ haračy dzień uletku, kali haspadynia narychtavała pa kusočku miasa, dy pieradom mała vymačyła. Heta adna sol, a ab smaku taksama niama što i kazać.

Marynavańnie nadta prosty sposab konservacyi. Tutaka karystajucca *ropaju* (žyžka z soli, cukru i saletry) abo voctam mocnym z rožnymi prydatkami.

Jość šmat inšych chimičnych sposabaŭ dziela konservacyi (kiśla salicylavaja, bornaja, formol i h.d.), adnača dziela škodnaści henych preparataŭ chimičnych na zdaroŭje čałavieka, nia tolki nielha imi karystacca, a na't nia jeść takich kanservaŭ dzie jany buduć.

Kab nie chvareć ciažka ad błahoha miasa, zaŭsiody treba dobra ahladzieć ci jano śviežaje. Nie biary nikoli miasa z błahim pacham, koŭzkaha z nienaturalnym koleram.

Чэхаславацкі гарэх

Гэткім словам хіба найлепш назваць усё тое, што апошнім часам дзеецца ўвакруг Чэхаславаччыны. Так, сапраўды гэта гарэх і то гарэх смашны, які паласаваць хацеў-бы шмат хто, ды... бяда з зубамі.

Ня нам тут сягоньня раскрываць, колькі праўды і колькі маны за гэты час пісалася і гаварылася аб Чэхаславаччыне. Раскрываецца гэта ўжо само, а будучыня дасьць такіх фактаў яшчэ больш. Напэўна. Але не забягайма наперад і прыгледзьмася да таго, што ўжо ёсьць.

Аснову Чэхаславаччыны, як дэмакратычнай рэспублікі, тварылі чэхі й славакі ў 1918 г., калі набліжаўся развал Аўстра-Вугорскай імпэрыіі. Гэтыя народы разам узятыя лічылі да 70 прац. усяго насельніцтва новае рэспублікі. Апрача таго ў склад Чэхаславаччыны ўвайшлі як нацыянальныя меншасьці немцы ды малы працэнт украінцаў, мадзяраў (вуграў) і палякоў.

Граніцы Чэхаславаччыны праходзяць каля Нямеччыны, Аўстрыі, Вугоршчыны, Румыніі і Польшчы. Пакуль у Нямеччыне не дайшоў да ўлады Гітлер з сваімі староньнікамі, нямецкая меншасьць Чэхаславаччыны захоўвалася спакойна, пасылаючы ў урад нават сваіх міністраў. Усё зьмянілася, калі ўладаром Нямеччыны стаў Гітлер, які пачаў імкнуцца да аб'еднаньня ўсіх Немцаў у адно гаспадарства; асабліва пасьля таго, як да Нямеччыны была далучана Аўстрыя. Ад гэтага часу чэхаславацкія немцы фармальна пачалі імкнуцца да шырокай аўтаноміі, за якой — для нікога гэта не сакрэт — крыецца спалучэньне з Нямеччынай; гэта тымбольш, што землі заселеныя немцамі (ці знемчанымі чэхамі) ляжаць уздоўж самай нямецкай граніцы.

Усьлед за немцамі пачалі арганізавацца мадзяры і палякі, якіх хоць значна менш, то аднак і яны спадзяюцца сабе нешта больш выторгаваць, чым маюць цяпер.

Асобную групу састаўляюць славакі і прыкарпацкія украінцы: гэтыя народы таксама дамагаюцца аўтаноміі, але тым розьняцца ад першых трох (немцаў, мадзяраў і палякоў), што Чэхаславаччыну цьвёрда ўважаюць за сваё супольнае дабро і навонкі супроць яе нігдзе ня выступаюць. А трэба сказаць, што гэтымі народамі, асабліва славакамі, стараюцца засланіцца ўсе тыя, хто у Чэхаславаччыне маюць укрытыя пляны свае собскія.

Які ход прыймуць усе гэтыя справы — прарочыць трудна. У кожным разе першая гарачка (19—22.V) мінула спакойна. Ужо-ужо снаваліся публічна пляны аб „разборы Чэхаславаччыны", ужо мяркавалі, што хто дастане, а тымчасам з усяго гэтага ня выйшла нічога. Не малую роль у ўтрыманьні міру выказала Англія; але і самая Чэхаславаччына так-жа не драмала, за што яе ўжо і празвалі катом, якога „як ня кінь, а ён усё роўна стане на чатыры лапы".

Пляны немцаў чэхаславацкіх ведамыя: яны бачаць сваё шчасьце ў межах Нямеччыны; мадзяры, натуральна, цягнуць у бок Мадзяршчыны; палякі — афіцыяльна дамагаюцца для сябе аўтаноміі. Характэрна пры гэтым зазначыць галасы прэсы польскай, якая пахваляючы ў прынцыпе дамаганьне сваіх аднапляменцаў, выразна кажа, што Польшч ня можа згадзіцца на тое, каб аўтаномію дасталі і Прыкарпацкія украінцы — якіх у Чэхаславаччыне прынамся двойчы гэтулькі, колькі палякоў. Гэтыя-ж палітыкі ня менш выразна кажуць і аб тым, што найлепш было-б, калі-б украінскае (русінскае) Прыкарпацьце, а нават і Славаччына, вярнуліся пад панаваньне Мадзяршчыны, спад каторага яны дасталіся на свабоду прад 20 гадамі.

Урэшце трэба яшчэ раз сьцьвердзіць, што між чэхамі й славакамі няма тых супярэчнасьцяў, аб якіх сягоньня кругом гавораць „апякуны" славакоў. Выявілася гэта надта выразна ў заяве аднаго з павадыроў краёвых славацкіх аўтаномістаў, пасла Сідора, які найвыразьней сказаў, што „славацкія аўтаномісты ніколі ня ўзыйдуць на шлях здрады Чэхаславаччыны". А др. Гледко, павадыр амэрыканскіх славакоў, што праяжджалі анагдай праз Варшаву ў Чэхаславаччыну, гэтак заклікаў вітаўшых яго варшавякаў:

„Адклікаюся да Вашага славянскага сэрца. Памагайце нашай Чэхаславацкай рэспубліцы, каторую мы памагалі будаваць. Едзем у Чэхаславаччыну з тэкстам Пітсбурскай умовы не на тое, каб дзяліць, але па тое, каб лучыць, каб узмоцніць чэхаславацкае паразумленьне".

Кожны з гэтага можа бачыць, што спор між чэхамі і славакамі калі і ёсьць, дык яны ўважаюць яго спорам нутраным, хатнім. Хто аднак гэты спор раздувае, той хоча відавочна закрываць свае ўбочныя пляны, з якімі адкрыта выступіць сягоньня стыдаецца.

В. К.



Прафэсар др. Ігнат Масьціцкі, які ўжо 12 гадоў ёсьць Прэзыдэнтам Польшчы.

Крапіва добры лек

Крапіва і крапіва жыгучка, якая так любіць расьці каля платоў на вёсцы, аказалася вельмі добрым лекам процiў крываўленьня. І ўсім, хто хворы, плюе кроўю, мае крывавыя адходы, кроўю ванітуе, або жанчына вельмі крывавіць, усім ім трэба піць завараную крапіву. Прыгатаўляецца яна гэтак:

Бярэцца ¼ клг. сьвежага лісьця крапівы і заліваецца 2 літрамі вару (кіпятку); пасьля трэба варыць яшчэ 1½ гадзіны, тады адцадзіць, засаладзіць да салодкасьці і піць па аднэй шклянцы ў дзень.

Крапіва мае так-жа ў сабе шмат жалеза і дзеля таго добра карміць худых дзяцей зупай з маладой крапівы.

Др. Я. М.

З цыклю: „ей“

* * *

Хай кажуць мне, —
што ты цяпер другая,
Хай кажуць мне, —
што ты цяпер з другім.
У душы ізноў надзея зацьвітае
І крыўды ўсе развеялісь, як дым.

Хай кажуць мне,
мінулае запомні;
Ніхто ня верне нам пражытых
[дзён.
У сэрцы жар вачэй тваіх чароўных
І голас твой,
як ліры ціхі звон.

Хай кажуць мне,
што ты наогул мрыя
І толькі брэдзь вясьняна-ціхіх
[сноў...
Усё прыйму...
зьміруся сам з сабою
І толькі-б раз, —
адзіны раз —
спаткаць цябе ізноў.

М. МАШАРА

ГОДЗЕ!

Дык годзе... і годзе... і годзе!
Піць сьлёзы з бяздоннага мора!
Пайду я па новай дарозе...
Да песьняў у сінім прасторы.

Я лётам арліным узьнімуся
Ў прастор паднябесны бясконцы
І скіну сваеў Беларусі,
Ўсе песьні ад зораў і сонца.

К. Бунтарны.

Дыктатуры і іхнія спусташэньні

Сучасную эпоху дыктатураў, якія ўасабляюць сабой праграмы цэлых народаў, Юры Дугамэль — сябра Францускай Акадэміі Навук, раўняе з дыктатурамі, што былі ў гісторыі, і выяўляе насьледкі іхняга спусташэньня.

Ваенныя дыктатуры.

Характэрнае зьявішча, што дыктатуры, як толькі пачнуць ваяваць, трымаюцца нядоўга.

Вялікая дыктатура Юлія Цэзара пачалася ў 49 і кончылася ў 44 годзе прад Нараджэньнем Хрыста. За гэтыя 5 гадоў Цэзар перайшоў цэлы тагачасны сьвет: уладаў Італіяй, Гішпаніяй, заняў Марсылію, ваяваў у Эгіпце і ў паўночнай Афрыцы, уладаў Рымам. Цэзара забіў Брут; пасьля забойства Цэзара разваліўся стары лад рымскае дзяржавы і пачалася хатняя вайна.

Александар Македонскі, які памёр маючы толькі 33 гады, заваяваў 20 народаў: нішчыў гарады, тварыў новыя падуладныя сабе дзяржавы, мяшаў расы, зьмяняў абычаі і гэтак рэфармаваў жыцьцё. Александар Македонскі пакінуў вялізарную дзяржаву, у якой пасьля яго сьмерці пачаўся разлад між ягонымі спадкаемнікамі.

Напалеон Бонопарт абвесьціў сябе цэзарам Францыі ў 1804 г., а ў 1815 г., пасьля няўдачнай бітвы пад Ватэрлёо, упаў. Ён заваяваў цэлую Эўропу, апрача Англіі. Царства трывала 11 гадоў. Пасьля гэтых войнаў Францыя моцна аслабела; ад таго часу Францыя пачала выміраць, а датуль была найбольш залюдненай краінай у Эўропе.

Дыктатура Кромвэльля ў Англіі, якая трывала праз 9 гадоў, таксама дала трагічныя насьледкі для народу і дзяржавы.

Дыктатарскае азьвярэньне.


Вельмі характэрная рыса маральнага і этычнага ўпадку кожнае дыктатуры. Раймонд Бургард, апісваючы геройства Александра Мацэдонскага, між іншым, зварачвае ўвагу на яго маральны ўпадак, які быццам п'янеючы ад улады нішчыўся распустай і адначасна тануў у разьмякласьці азіяцкага жыцьця. Пры гэтым узрастала ў яго жорсткасьць да крайнасьці азьвярэньня.

Цэзар таксама стаўся распусьнікам, быў няміласэрна жорсткі, нялюдзкі. Бясспрэчна, гэта быў чалавек інтэлігентны, але інтэлект ягоны быў сьціраваны ў бок зла, а не дабра. Ён, каб дакучыць свайму праціўніку Помпэю, пасьля перамогі яго, загадаў замучыць на сьмерць 50.000 ягоных ваякоў.

Маральнае спусташэньне дыктатурай народу.

Юры Дугамэль, пасьля агульнай характэрыстыкі найбольшых дыктатураў, робіць вывад, што кожная гэткая дыктатура даводзіла грамадзкі лад да кіраўніцтва бізуном; кожная дыктура нішчыла пачуцьцё грамадзкае справядлівасьці, свабоду слова і нават свабоду думкі. Пасьля дыктатуры народ ператвараўся ў чалавечую стаду бязвольных і бесхарактарных людзей.

Сучасныя эўрапэйскія краіны пад уладай Мусолініга, Гітлера і Сталіна — піша Дугамэль — стаяць на шляху да гэткай сваей будучыні. А калі ўсе іншыя народы ня змогуць супроцьстануць нагласьці амбіцыі паасобных адзінак, дык чалавецтва будзе сапхнута на самае дно маральнага спусташэньня і гэтак загіне сучасная, абапёртая на хрысьціянстве, цывілізацыя і культура.



Zbiełaruskaha žyćcia

Novaja biełaruskaja kulturnaja siła. 19.V.38 ŭ vilenskim universytecie atrymaŭ dyplom inžyniera— ahranoma supracoŭnik „Šlachu Moładzi“ hram. Pilip Zasim. — Vitajem jaho i žadajem płodnaje pracy na rodnaj biełaruskaj nivie!..

Biełaruski Studencki Sajuz pracuje. Nia hledziačy na toje, što ciapier dla studentaŭ haračy čas ekzaminaŭ, Bieł. Stud. Sajuz nia spyniaje svaje pracy. Jon i dalej ładzić roznyja siabroŭskija studenckija imprezy, a taksama referaty z haliny biełarusaviedy. I tak napr. u minułym tydni BSS naładziŭ dva referaty, jakija adbylisia ŭ VI zali hałoŭnaha budynku vilenskaha universytetu. Pieršy referat, 25.V, ab biełaruskaj narodnaj pieśni pračytaŭ Maksim Tank, a druhi, 28.V, ab kirunkach, u biełaruskaj savieckaj litaratury mgr. J. Šutovič. Jak ilustracyi da referatu mgr. J. Š. strojna čytaŭ niekatoryja tvory biełaruskich savieckich piśmieńnikaŭ mgr. J. Chvorast. Treba skazać, što referat mgr. J. Š. ab biełaruskaj savieckaj litaratury ŭ niekatorych mamentach prosta revelacyjny. Słuchajučy hetych referataŭ, a taksama čytanych tvoraŭ, možna sapraŭdy sabie ŭjavić, jakich vołataŭ słova i dumki mieła ŭžo biełaruskaja litaratura i jak vialikija straty prynios Biełaruskamu Narodu maskoŭska-kamunistyčny režym, jaki źnistožyŭ najlepšyja litaraturna-maładniackija biełaruskija siły, zatoje, što hałoŭnymi matyvami ichniaha tvorstva była Biełaruś, luboŭ da svajho Biełaruskaha Narodu, da praŭdy, svabody i spraviadlivaści.

20-ja ŭhodki śmierci Karusia Kahanca. 20.V sioleta minuła 20 hadoŭ ad śmierci vydatnaha biełaruskaha piśmieńnika Karusia Kahanca.Šyrej ab im napišam paśla.

U čeść 750-ch uhodkaŭ „Słova ab pałku Iharavym“. 29.V.38 ŭ Vilenskaj Biełaruskaj Himnazii adbyłosia śviatkavańnie 750-ch uhodkaŭ słaŭnaha i vielmi mastackaha biełaruskaha litaraturnaha tvoru (paemy) „Słova ab pałku Iharavym“, napisanaha ŭ 1187 h. Referat ab hetym tvory pračytaŭ dyrektar Mikałaj Ancukievič, a paśla byli pračytany niekatoryja pieśni (raździeły) hetaha-ž tvoru ŭ tahočasnaj biełaruskaj movie, a taksama i ŭ apracoŭcy sučasnych bieł. piśmieńnikaŭ.

Sioletnija maturysty Vil. Biełaruskaj Himnazii. Da maturalnych ekzaminaŭ sioleta ŭ Vilenskaj Biełaruskaj Himnazii prystupała 17 vučniaŭ, a zdało 16. Proźviščy ich nastupnyja: Brazoŭski Anatol, Biełasik Aleksandar, Buzuk Ivan, Drućko Maryja, Duk Viačasłaŭ, Kaźlanka Aŭdoćcia, Lotka Mikałaj, Macuk Jury, Novik Vasil, Sładkoŭski Barys, Taŭłaj-Narastaŭcaŭ Aleksandar, Čatyrka Jury, Piaršukievič Viera, Karetnik Janina, Makoŭskaja Nina. Usich vitajem i žadajem udačy ŭ dalejšaj navucy, a tak-ža zaklikajem da pracy na biełaruskaj maładniackaj nivie.

200 a nie 220 zł. Usim zacikaŭlenym źviartajem uvahu, što ŭ abviestcy ab Biełaruskaj Himnazii, drukavanaj u „Šlachu Moładzi“, pamyłkova padana, što płata za navuku ŭ hetaj himnazii ŭ hod 220 zł. Faktyčna-ž płata za navuku ŭ hod nie 220 zł. a **200 zł.** Pry tym niezamožnyja i zdolnyja vučni majuć mahčymaść dabivacca źnižki.

Biełarusy i 1-šy maj. Papularnaść śviata pracy z kožnym hodam u biełaruskich pracoŭnych masach uzrastaje. Sioleta miž inšym biełarusy arhanizovana pryjmali ŭdzieł u śviatkavańni 1-ha maja ŭ Słonimie, dzie na sabrańni byli pramovy i pabiełarusku, a taksama ŭ Baranavičach, Michałovo-Niazbudcy i Horadni, dzie biełaruskija sialanie i rabotniki tvaryli asobnyja hrupy i śpiavali biełaruskija pieśni.

Biełarusy ŭ Francyi. U Francyi žyvie kala 500.000 asob emihrantaŭ z Polskaha Haspadarstva, siarod jakich niamała jość i biełarusaŭ, katoryja apošnim časam stvaryli svaju arhanizacyju i vydajuć navat u Paryžy svaje biełaruskija časapisy: „Biuleteń“ i „Recha“. Kirunak hetych časapisaŭ radykalny, ale adnačasna demakratyčny i nacyjanalny. Jany choć dalikatna, adnak stanoŭka vystupajuć suproć praśledavańnia biełaruskich palityčnych i kulturnych pracaŭnikoŭ, piśmieńnikaŭ i paetaŭ u Savieckaj Biełarusi, damahajučysia adnačasna rehabilitacyi zahnanaha ŭ Sibir maskoŭskimi čekistami Br. Taraškieviča i jahonych tavaryšaŭ z „Hramady“ i „Zmahańnia“, abvieščanych tak-ža „vorahami narodu“.

Prypaminajem, što 12.VI.38 z Vilni jdzie ŭ Kalvaryju Biełaruskaja Pilihrymka.

Вялікі беларускі канцэрт у Варшаве

Асьветнае Таварыства Беларусаў у Варшаве арганізавала 24.V.38 г. вокальны канцэрт, на якім выступіў ведамы ў Польшчы і заграніцай наш мастак сьпеву Міхал Забэйда-Суміцкі. Акомпаніяваў праф. Я. Лефэльд. Заля Варшаўскай Кансэрваторыі, дзе адбываўся канцэрт, напоўнілася шматлікімі слухачамі, сярод якіх многа было прадстаўнікоў прэсы, літаратуры, людзей музыкі і мастацтва.

Канцэрт складаўся з дзьвёх частак: у першай частцы былі песьні і арыі розных слаўных кампазытараў, як Качіні, Шубэрт, Чайкоўскі і інш., а ў другой — беларускія народныя песьні ў апрацоўцы: Казуры, Грэчанінава, Туранкова і Галкоўскага. Забэйда-Суміцкі, як заўсёды, узяў слухачоў сваім талентам у валаданьне і дарыў іх багацтвам песьняў беларускіх і песьняў іншых народаў.

Беларусы ў Варшаве мелі на гэтым вечары незабытыя перажываньні, сапраўдную духовую роскаш. Слухаючы роднай песьні, песьняў матак нашых і сясьцёр, песьняў палёў, лясоў нашых і працы, не аднаму з нас, закінутаму жыцьцёвым горам на чужыну, сьлёзы цісьнуліся да вачэй. І калі песьня „Як памёрла матулька“ (гарм. Туранкова) многіх давяла да сьлёз, дык вясёлая караводная песьня „Цераз сад вінаград“ (гарм. Галкоўскага) выклікала такую вялікую агульную вясёласьць і буру воплескаў, што мастак мусіў гэту песьню паўтарыць. На агульнае дамаганьне і бесканечныя воплескі М. З.-С. мусіў аж пяць разоў выступаць на біс, пры гэтым „Лявоніху“ „прымусілі“ паўтарыць аж два разы. У другой частцы канцэрту заслужанаму нашаму мастаку паднесены быў вялікі букет кветак з беларускімі народнымі шарфамі з напісам: „Мастаку М. Забэйдзе-Суміцкаму ад Асьв. Т-ва Беларусаў у Варшаве“.

Канцэрт на ўсіх прысутных зрабіў вялікае ўражаньне. Усе пакідалі залю здаволеныя, вясёлыя і з пачуцьцём пашаны да багацтва нашай народнай песьні і яе слаўнага выканаўцы, якому ўсе былі глыбока ўдзячны.

Канцэртам гэтым А.Т.Б. зрабіла шырокі разгалос у культурным сьвеце Варшавы.

М.

ШТО ЧУВАЦЬ

— Газэты йзноў пішуць, што ў **Польшчы** ў хуткім часе мае быць зьмена ўраду, а як будзе—пабачым.—Тымчасам разлад між рознымі палітычнымі польскімі партыямі паглыбляецца. Нацыяналісты розных эндэцкіх групкаў ужо ня толькі нападаюць на работнікаў, але і між сабой крывава распраўляцца. Між іншым нядаўна была агульна-польская студэнцкая каталіцкая пілігрымка да цудоўнага абраза ў Чэнстахове. Вось-жа, калі прыбліжалася гэта пілігрымка да сьвятога месца, між яе ўчасьнікаў паўстала крывавая бойка, якую разганяць прыйшлося паліцыі. Пры тым некалькі цяжка параненых асоб былі забраныя ў шпіталь.

— У **Японіі** наступіла зьмена ўраду. Цяпер улада там бадай поўнасьцю ў руках вайсковых кругоў, каторыя быццам уважаюць, што без вайны Японіі з Саветамі не абыйдзецца. Дзеля таго заграні́чныя наглядчыкі на Далёкім Усходзе ўважаюць, што ў найбліжэйшым часе можа дайсьці да вайны між Японіяй і СССР. Новы японскі ўрад узмацніў такжа японскую атаку на **кітайцаў**, каторыя ўсімі сіламі бароняцца.

— Каля справы **Чэхаславаччыны** быццам спакайней. Некаторыя аднак газэты спакой гэты ўважаюць пераходным і пішуць, што найбольш трывожным часам будзе дзень 12-га чэрвеня, калі канчацца выбары ў самаўрад. Тады можна спадзявацца выступленьня нацыянальнае меншасьці **нямецкае і мадзярскае** супроць Чэхаславаччыны. Пры тым быццам аружна выступіць **супроць Чэхаславаччыны Нямеччына і Мадзяршчына**. Усё гэта аднак толькі дагадкі, якім верыць ня надта можна, бо такое выступленьне грозіць Эўропе вялікімі падзеямі. Ды ўсё-ж такі **Францыя і Англія** моцна сьлядзяць за тым, што робіць Гітлер і хто ведае, ці дазволяць яму далей рабіць тое, што яму хочацца.

— У **Гішпаніі** далей канца вайны ня відаць, хоць фашыстаўскія атакі, падмацоўваныя **Італіяй**, вельмі ўзмагліся. Рэспубліканцы (ўрадаўцы) аднак, ня гледзячы на тое, што ня маюць вялікае помачы з заграніцы, пагеройску змагаюцца і не паддаюцца.

— Фашысты далей стараюцца захопліваць уладу і ў іншых краінах. Як мы ўжо пісалі, нядаўна быў фашыстаўскі бунт у **Бразыліі**, пасьля гэтага паўстаў такі-ж бунт у **Мэксыку**, але і тут, так як і ў Бразыліі, фашыстам не ўдалося,—іхні бунт быў зламаны.

— **Гітлеру** ўсьцяж мяшаюць каталіцкія арганізацыі моладзі і ён з імі востра змагаецца. Барацьба гэта ня сьціхае, а нават разгараецца. У цяперашні мамэнт найбольш яна праяўляецца ў б. **Аўстрыі**, дзе гітлераўцы сілком заводзяць свае парадкі. З гэтай прычыны паўстаюць проста трагедыі. Ужо тысячы людзей, ня могучы вытрымаць новага рэжыму, пакончылі самагубствам.

— Агульнае збраеньне гаспадарстваў далей адбываецца ўскораным тэмпам. Адначасна замацоўваецца саюз **Англіі і Францыі.** *jn.*

Na dapamahovy fond biełaruskaj moładzi pry „Šl. Mł."

achviaravali: M. Halasievič 50 hr., V-č 1 zł. Usim achviaradaŭcam ščyra dziakujem.

Red. Kal. „Šlachu Moładzi".

Грамадзяне! Памятайце аб бел. моладзі і прысылайце ахвяры на дапамаговы фонд беларускай вучнёўскай незаможнай а здольнай моладзі на адрыс: Red. „Šlachu Moładzi" — Wilno, Zavalnaja 1.

Трагічная сьмерць палк. Коновальца

23 мая сёлета ў м. Ротэрдам у Галяндыі трагічна памёр ведамы украінскі дзеяч, палкоўнік Аўген Коновалец. Згінуў ён ад разрыву бомбы, якую падаў яму правакатар Валюх у замаскаваным пакеце. Цяпер усе стараюцца разгадаць, хто стаяў за плячыма Валюха, каторы бязсьледна зьнік, і каму так моцна мяшаў палк. Коновалец?

Найбольш падае падазрэньне на Саветы, што яны загадалі забіць палк. Коновальца, бо ён быццам быў у кантакце з Японіяй, меў свае нелегальныя антыкамуністычныя арганізацыі на Далёкім Усходзе і ў Савецкай Украіне, дзе рабіў падгатоўку да рэвалюцыі.

Палк. Коновалец стала жыў у Бэрліне, Вене, а апошнім часам у Італіі; часта аднак езьдзіў і ў іншыя гаспадарствы. Польскія часапісы называюць яго павадыром нелегальных украінскіх тэрорыстычных арганізацыяў У. В. О. (Украінскай Вайсковай Арганізацыі) і У.Н.О. (Украінскай Нацыяналістычнай Арганізацыі), каторым закідваюць, што яны арганізавалі ў Польшчы тэрорыстычную акцыю і што сябры гэтых арганізацыяў забілі міністра Перацкага, пасла Галувку і інш. выдатных дзеячоў.

Ангелійскія газэты называюць палк. Коновальца найгразьнейшым тэрорыстам ў Эўропе.

Абвяшчаецца, што 17-га чэрвеня 1938 году адбудуцца

ўступныя экзамены

ў Віленскую Беларускую Дзяржаўную Гімназію

Варункі прыйма:

У I КЛЯСУ прыймаюцца дзеці (хлапцы і дзяўчаты) якія: 1) будуць мець на 1-га верасьня 1938 г. ня менш 12 і няпоўных 16 гадоў і 2) скончылі 6 (шэсьць) ці 7 (сем) аддзелаў пачаткавай школы. Хто перарос ня больш як на адзін год, можа складаць просьбу ў Куратарыю аб дапушчэньні да экзамену. Хто прадставіць пасьведчаньне аб сканчэньні 6 ці 7 аддзелаў пач. школы, той здае экзамен паступаючы у I-ю кл. (былую III кл.) толькі з польскае мовы, арытмэтыкі і географіі. Іншыя кандыдаты здаюць поўны экзамен з 6-ці аддзелаў пач. школ.

У II КЛЯСУ прыймаюцца дзеці па экзамену з усіх прадметаў у абойме праграмы I кл. гімназіі, калі на 1.IX.1938 г. будуць мець ня менш 13 і ня больш 16 гадоў.

Заявы прыймаюцца да 15 чэрвеня 1938 г. Да заявы трэба далучыць: 1) мэтрыку, 2) школьнае пасьведчаньне, 3) пасьведчаньне аб прышчэпе воспы, 4) дэкларацыю аб тым, што кандыдат па нацыянальнасьці беларус; ды пераслаць на Р. К. О. (блянкет можна купіць на кожнай пошце) 10 зл. за экзамен на наступны адрыс: Filija Białoruska Państwowego Gimnazjum im. J. Słowackiego w Wilnie P. K. O. № 703.304. — Плата за навуку 200 зл. у год.

Віленская Беларуская Гімназія мае такія самыя правы, як і польскія дзяржаўныя гімназіі.

Адрыс Бел. Гімназіі наступны: ***Białoruska Filija Państw. Gimnazjum im. J. Słowackiego — Wilno, ul. Dominikańska 3/5.***



Беларускія прадстаўленьні

Стоўпцы. Беларускія прадстаўленьні ў Стаўпецкім павеце глыбака ўвайшлі ў народзе ў звычай. Беларускага прадстаўленьня, беларускае вечарыны — гэтай адзінай культурнай разрыўкі патрабуе ня толькі беларуская моладзь, але і старэйшыя людзі — сяляне і сялянкі. І ўжо ўсе прывыклі, што прынамсі на кожнае большае сьвята мусіць быць беларускае прадстаўленьне. Дык не абыйшлося бяз гэтага і на сёлетні Вялікдзень. На другі дзень гэтага вялікага сьвята, г. зн. 25.IV.38 адбыліся беларускія вечарыны ў наступных мясцох: 1. у м-ку Новы—Сьвержань — ставілі опэрэтку „Перашкода“; 2. у в. Галавенчыцы — ставілі п'есы: „Па рэвізіі“ і „Мікітаў лапаць“; і 3. у Старым-Сьвержані, дзе было беларускае прадстаўленьне, а пасьля скокі. — Усе гэтыя вечарыны адбыліся ў найлепшым парадку, у мілым беларускім настрої, культурна і прыгожа. Людзей, асабліва моладзі, усюды і заўсёды на бел. вечарынах бывае, і гэтым разам было таксама, вельмі многа. Беларускія прадстаўленьні гэта сапраўды вельмі карысныя культурныя разрыўкі, якія раджу ладзіць усюды, дзе ёсьць, дзе жывуць беларусы.
Р. С.

Бойка на фэсьце

Беніца, Маладэчанскі пав. На Юр'я, 6.V сёл. у Беніцы адбыўся праваслаўны фэст, на які сабралася вельмі многа народу. Усё было-б добра, каб не гарэлка, аднак, нажаль, без яе не абыйшлося. Нашы хлапцы замест таго, каб пайсьці ў царкву і маліцца, панапіваліся гарэлкі і пачалі біцца, і то якраз тады, калі ў царкве йшла Служба Божая. Бачылі гэта некаторыя польскія жыхары нашага мястэчка і гаварылі насьмяхаючыся: „Ці хамі не ўмеён заховаць сен нават в часе Мшы сьв.“ — Сапраўды, цяжка было глядзець на бойку і слухаць гэтых слоў. — Вось-жа, дарагія браты маладыя, пара ўжо нам перастаць быць пасьмешышчам. Гэта-ж стыд і ганьба, каб з нас сьмяяліся. Няхай яна згіне гэта праклятая гара, калі яна мае даводзіць нас да такіх сумных аб'яваў. Пара ацьверазець, даўно ўжо пара кінуць піць гарэлку, бо яна нас да дабра не вядзе!..
У. Бараноўскі.

Беларусы на зьезьдзе «Стронніцтва Людовага»

Беласток. 15.V.38 у Беластоку адбыўся зьезд польскага „Стронніцтва Людовага“ Беластоцкага вокругу. Між іншым былі на гэтым зьездзе і беларускія сяляне, каторыя выступалі нават з сваімі беларускімі прамовамі. З гэтай прычыны хачу я зрабіць сваю маленькую ўвагу. Мне здаецца, што ўсёж-такі нам беларусам з польскім „Стронніцтвам Людовым“ не падарозе і няма чаго туды беларускім сялянам лезьці. Уважаю нават, што тыя сяляне, якія былі на зьезьдзе ў Беластоку і выступалі з беларускімі прамовамі, нічога гэтым не асягнулі і кепска таксама зрабілі, што ўпісаліся ў чужую арганізацыю. Нам беларусам і „Стр. Людовае“ не нясе нічога добрага. Беларус павінен старацца працаваць у сваіх беларускіх арганізацыях, а калі іх няма, дык саматужна рабіць тое, што ўдасца, але сваё беларускае і на сваіх беларускіх гонях!.. Трэба пашыраць беларускую нацыянальную сьведамасьць, беларускія часапісы, кніжкі, вучыць дзяцей чытаць і пісаць пабеларуску, старацца каб адбываліся беларускія прадстаўленьні нават ад імя польскіх арганізацыяў і г. д. — Гэта будзе работа беларуская, культурная і карысная... Чужая арганізацыя можа нас завясьці на чужы блудны і некарысны нам шлях!.. Аб гэтым нам трэба памятаваць усьцяж і заўсёды!..
Сьведка.



Prakuryli bolš 7 miljardaŭ złotaŭ. Niadaŭna apublikavanaja statystyka padaje, što ŭ 1937 h. u Polskim Haspadarstvie skurana papiarosaŭ i ahułam tytunu na 7 milijardaŭ 302 milijony złotaŭ. U 1936 h. było prakurana tolki 6 milijardaŭ 217 milijonaŭ. Jak bačym, vydatki na biaspatrebnaje i škodnaje kureńnie pavialičajucca, nia hledziačy na narakańni, što ciažka žyviecca. Pry tym cikava, što najbolš prakuryvajuć vajavodztvy našyja, dzie ŭsiu škodnaść kureńnia pavinny byli-b usie daŭno zrazumieć i kožny hroš addavać na rodnuju aśvietu knižku i hazetu.

Паштовая скрынка

А. Г.: Апавяданьне „Сон беднага селяніна” слабаватае. Няма ў ім ніякае глыбейшае думкі, апісаньне не прадстаўляе мастацкае вартасьці. Здольнасьці аднак да прозы ў Вас праяўляюцца, дык радзім пяра ня кідаць, а рабіць далейшыя ў гэтым кірунку спробы.

Др. М.: Прысланыя матар'ялы, як бачыце, выкарыстываем. За ўвагі дзякуем і просім не забываць.

Я. Брылю: Атрымалі, дзякуем, падробны адказ у паштоўцы.

М. Вольнаму ў Латвіі: Што будзем магчы, вышлем. Прывітаньне!

Косьці: Карэспандэнцыю атрымалі, надрукуем. „Шлях Мол.” будзем высылаць.

Žalejcy: Recenzija Vaša, biazumoŭna, maje vartaść, nia možam adnak jaje nadrukavać, bo raniej atrymali recenziju ad M., i jana ŭžo była zdana ŭ druk. Pryvitańnie!...

A. Bušku: Hrošaj ad Vas my nie atrymali i dziela taho i časapisu nie vysyłali. Napišycie dakładna, kali Vy vysłali padpisku, a moža majecie pakvitavańnie z pošty dyk pryšlicie nam, a my budziem staracca ŭsio vyjaśnić. Dalej „Šl. Mol.“ budziem vysyłać.

Я. Чорнаму: Матар'ялы атрымалі, дзякуем, у меру магчымасьці будзем друкаваць. Вам „Шлях Мол.“ высылаем акуратна і просім дамагацца на пошце. Ані з Руды, ані з Міхневіч грошай мы не атрымалі і дзеля таго часапісу ім не высылаем. Калі яны грошы выслалі, дык няхай паведамяць нас, калі гэта было, або прышлюць паштовыя паквітаваньні; тады мы ўсё выясьнім і часапіс будзем высылаць. Вершы і карэспандэнцыю ў „Зорку“ перадалі.

А. Шынкевічу: Карэспандэнцыю атрымалі, надрукуем у наступным нумары. Просім пісаць часьцей.

Сьведку і Ул. Бранsocкаму: Карэспандэнцыі атрымалі, дзякуем; як бачыце — друкуем.

Каровапасу: Прыяжджайце на 11 і 12 чэрвеня, начлег будзе. За грошы і добрыя зычэньні дзякуем.

St. Rakoŭski: Prośbu spaŭniajem i čakajem na abiacanaje.

„Шлях Моладзі“ рэдагуе Рэдакцыйная Калегія. Друкуецца ў Беларускай Друкарні ім. Фр. Скарыны ў Вільні (Завальная 1-2) коштам працы: Я. Багдановіча, Я. Найдзюка і А. Шутовіча.

Адрыс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Завальная вуліца № 1—2 (Wilno, Zawalna 1—2).

„ШЛЯХ МОЛАДЗІ“ выходзіць два разы ў месяц: 5 і 25. Падпіска на год 2 зл. і 50 гр., на паўгода 1 зл. 50 гр., на 3 мес.—75 гр. Цана аднаго экзэмпляра 15 грошаў. — Заграніцу ўдвая даражэй. — Нумар картатэкі „przekazu rozrachunkowego” 59.

Выдавец: „БЕЛПРЭС“. Рэдактар: Я. НАЙДЗЮК.